# Вялікая любоў Максіма Багдановіча

## Да 125-годдзя з дня нараджэння паэта

Таленавіты, прыгожы, ён пайшоў з жыцця ўсяго ў 25. Кахаў. І яго кахалі. Але вялікай, сапраўднай, асаблівай любоўю Максіма Багдановіча была беларуская зямля. Застаецца толькі здзіўляцца, як змог малады паэт, пражыўшы ўдалечыні ад Радзімы амаль усё свядомае жыццё, пранікнуцца да яе такім глыбокім пачуццём. Пачуццём, якое на ўвесь свет зазіхацела «пацеркамі зор» Багдановічавых вершаў. І на якое наша краіна адказала – а ці можна было не адказаць? – самай шчырай узаемнасцю. 125-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча – добрая нагода асэнсаваць перадумовы з'яўлення ў беларускай літаратуры такога ўражальнага феномена.

### «Краю мой родны…»

Шмат адказаў на тыя ці іншыя загадкі лёсу можна знайсці ў радаводзе чалавека, таму першым чынам звернемся да сямейнага дрэва Максіма Багдановіча. Як вядома, маці паэта Марыя Апанасаўна Багдановіч, у дзявоцтве Мякота, паходзіла са старажытнага беларускага шляхецкага роду (герба «Курч»). Беларускія карані меў і бацька Адам Ягоравіч, праўда, яго продкі з сялян – дакументы сведчаць аб тым, што некалькі пакаленняў сям'і былі прыпісаны да маёнтка Касарычы Бабруйскага павета Мінскай губерні. Таму можна смела гаварыць аб тым, што бязмернае захапленне паэта Беларуссю, нягледзячы на расстанне, было ў некаторай ступені прадвызначана генетычнай спадчыннасцю.

Наша сэрцаназаўсёды захоўвае цёплае пачуццё да тых мясцін, дзе мы з'явіліся на гэты свет. Як вядома, Максім Багдановіч не проста нарадзіўся на беларускай зямлі, але і правёў тут першыя пяць гадоў жыцця. Перыяд, даволі важны для фарміравання асобы чалавека: дзіця, як губка, убірае ўсё пачутае і пабачанае. Невядома, ці памятаў Максім што-небудзь са свайго беларускага дзяцінства, але тое, што яно пакінула след у яго душы, бясспрэчна.

Мінск, Гродна, вёска Вяззе – яны адыгралі сваю ролю ў першыя гады жыцця будучага вядомага паэта. Нарадзіўся ён 9 снежня (па новым стылі) 1891 года ў Мінску. У хуткім часе яго бацька Адам Ягоравіч уладкаваўся на новую працу, і сям'я пераехала жыць у Гродна. Хлопчык рос у атмасферы ўзаемнай любові, і сцены іх гродзенскага дома, у якім у наш час працуе музей паэта, не раз чулі яго шчаслівы смех. А былі яшчэ некалькі вясенніх і летніх месяцаў у вёсцы Вяззе (цяпер Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці), дзе маці Марыя Апанасаўна з дзецьмі гасцявала ў радні. Максім шмат часу праводзіў



▶ Максім Багдановіч. 1911 год



на прыродзе, з цікавасцю адкрываў для сябе вясковае жыццё. Ніхто і падумаць не мог, што хутка здарыцца трагедыя, якая жорстка зменіць лёс сям'і, – у кастрычніку 1896 года з-за хуткацечнага туберкулёзу маці ўсяго ў 27 гадоў пойдзе з жыцця. Яе пахавалі на беларускай зямлі – на гродзенскіх праваслаўных могілках. А аўдавелы бацька з дзецьмі пакінуў родны край, пераехаўшы жыць у Ніжні Ноўгарад, куды быў пераведзены па службе.

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ў шэрагу іншых каштоўных дакументаў і рэчаў захоўваецца ўнікальны стары фотаальбом сям'і Багдановічаў. Сямейную рэліквію ў 1968 годзе передала сюды Аўгуста Іванаўна Багдановіч – удава аднаго з малодшых братоў класіка нашай літаратуры, Паўла. У альбоме ёсць і фотаздымкі «беларускага» перыяду сям'і. Глядзяць са старых картак маладыя, прыгожыя Марыя Апанасаўна і Адам Ягоравіч, іх першынец Вадзім, маленькі Максім… Можна ўявіць, як часта, сумуючы па маці, будучы паэт браў гэты фотаальбом у рукі і ўглядаўся ў родны твар. І нельга не пагадзіцца з думкай, якой падзялілася з намі дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Ганна Запартыка:

– На мой асабісты погляд, любоў Максіма Багдановіча да Беларусі шмат у чым была абумоўлена любоўю да маці, якую ён так рана страціў. Унутры яго жыла неверагодная туга па тых днях дзяцінства, калі яны яшчэ былі разам, па той зямлі, сцежкі якой памятаюць крокі Марыі Апанасаўны і на якой засталася яе магіла. Менавіта зерне памяці пра маці прарасло такой вялікай любоўю да Беларусі, да яе гісторыі, мовы, людзей, якая і сёння не перастае нас здзіўляць і цешыць.

## «А дзе ж тая крынічанька…»

З пяцігадовага ўзросту будучы класік беларускай літаратуры выхоўваўся ў рускамоўным асяроддзі спачатку Ніжняга Ноўгарада, потым Яраслаўля. На першы погляд, нічога не спрыяла яго звароту да зямлі і мовы продкаў. Але гэта толькі на першы погляд. І ў наўгародскі (1896–1908), і ў яраслаўскі (1908–1916) перыяды жыцця побач з Максімам былі людзі, якім мы ў той ці іншай ступені абавязаны з'яўленнем на небасхіле беларускай літаратуры адной з яе самых яркіх зорак.

Перш за ўсё гэта бацька паэта Адам Багдановіч. Настаўнік па адукацыі, ён добра ведаў беларускую мову, быў аўтарам шэрага навуковых прац і артыкулаў этнаграфічнага і гістарычнага характару. Друкаваўся ў газетах «Минские губернские ведомости», «Минский листок», «Виленский вестник», «Гродненские губернские ведомости». Асобнымі манаграфіямі былі выдадзены яго гістарычны нарыс «Про панщину. Очерк крепостного быта в Белоруссии» (Гродна, 1894) і этнаграфічны нарыс «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» (Гродна, 1895).

У сваіх успамінах Адам Багдановіч прызнаўся, што любоў да беларускага фальклору дасталася яму ад маці, Анэлі Фамінічны, якая была выдатнай носьбіткай народных традыцый. Ён, як мог, імкнуўся захаваць яе спадчыну і перадаць сваім сынам. Адам Ягоравіч узгадваў, што менавіта па запісаных ім са слоў сваёй маці народных казках Максім упершыню пазнаёміўся з беларускай мовай. І што на некаторыя сюжэты для будучых вершаў яго натхніла менавіта спадчына бабулі Анэлі. Так, вядомы верш «Змяіны цар» з цыкла «У зачараваным царстве» ўяўляе сабой паэтычную перапрацоўку народнага павер'я ў яе пераказе.

«Мяне выхоўваў бацька. Неяк я паказваў вам яго бібліятэку. У ёй ёсць усё істотнае, што з'явілася калі б то ні было ў літаратуры ўсяго свету. Мы з дзяцінства праходзілі гэтую сусветную школу… Зразумела, галоўная ўвага звярталася на славянскія літаратуры», – прызнаваўся Максім Багдановіч аднаму са сваіх калег па журналісцкай працы Мікалаю Агурцову. Гэтыя радкі, як кажуць, гавораць самі за сябе. Застаецца толькі дадаць: бібліятэка Адама Ягоравіча была такая вялікая, што нават яго сябра, знакаміты рускі пісьменнік Максім Горкі, пэўны час прызнаваў яе багацейшай за сваю. Пры гэтым старэйшы Багдановіч вельмі ўважліва сачыў, каб яго сыны чыталі кнігі згодна са складзенымі ім спісамі. Пры такім грунтоўным падыходзе ці варта здзіўляцца, што ў свае маладыя гады Максім Багдановіч меў сапраўды ўражальныя шматбаковыя веды і шырокі кругагляд, якія складалі надзейны падмурак яго паэтычнай і публіцыстычнай дзейнасці.





◄◄Бацька паэта Адам Ягоравіч Багдановіч

◄ Маці паэта Марыя Апанасаўна Багдановіч

Так, у бацькі і сына Багдановічаў былі супрацьлеглыя погляды на перспектывы беларускага адраджэння. Адам Ягоравіч, у адрозненне ад Максіма, ставіўся да іх скептычна, яго цікавілі выключна гісторыя і этнаграфічныя традыцыі беларускага краю. Аднак нельга не прызнаць – у першую чаргу менавіта бацька паспрыяў абуджэнню ў сына цікавасці да Беларусі і хоць не падштурхоўваў яго да беларускай творчасці, але і не перашкаджаў. Уражвае таксама тое, як беражліва захоўваў Адам Ягоравіч творчую спадчыну сына. Куфар з матэрыяламі, якія мелі дачыненне да асобы і літаратурнай дзейнасці паэта, быў уратаваны нават падчас моцнага пажару ў іх яраслаўскім доме – а там загінулі і ўнікальная бібліятэка, і амаль уся маёмасць сям'і. Як вядома, сучаснае акадэмічнае багдановічазнаўства грунтуецца ў асноўным менавіта на тым, што захаваў для нашчадкаў і перадаў у Беларусь Адам Багдановіч. Каб яшчэ ўнікальны архіў не знік у гады Вялікай Айчыннай вайны…

Сваю станоўчую ролю ў абуджэнні нацыянальнай свядомасці нашага будучага класіка адыгралі і дзве яго цёткі, родныя сёстры бацькі. Пасля пераезду ўслед за братам у Ніжні Ноўгарад яны выйшлі замуж і стварылі ўласныя сем'і, але, як пісаў Адам Багдановіч, уяўлялі сабой адну сям'ю ў трох розных кватэрах, былі своеасаблівай «белорусской колонией в далеком краю при слиянии Оки и Волги». Сястра Магдалена вяла сям'ю так, як гэта рабілі яе маці Анэля і бабуля Рузаля: шанавала народныя звычаі і абрады, спраўляла святы. Максім у наўгародскі перыяд свайго жыцця бываў у цётак вельмі часта, бавячы вольны час са стрыечнымі братамі і сёстрамі. Тут ён чуў беларускія казкі, песні, прыказкі. Радок з песні «А дзе ж тая крынічанька, што голуб купаўся», якую часта напявала цётка Магдалена, Максім выкарыстаў пазней у сваім вершы «Вечар».



▼ Фотаальбом сям'і Багдановічаў (з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва)




Дзіядор Дзябольскі



Сяргей Арлеанскі




Андрэй Кіпрыянавіч і Вера Мікалаеўна Кабанавы

(фотаздымкі прадастаўлены Літаратурным музеем Максіма Багдановіча)

А вось родныя і стрыечныя браты і сёстры Максіма, на жаль, мала цікавіліся «беларускай тэмай». Адарваныя ад зямлі продкаў, яны не адчувалі патрэбы шукаць да яе свой шлях.

– Гісторыя рукапіснага зборніка паэзіі Максіма Багдановіча «Зеленя», які захоўваецца ў нашым музеі, звязана са стрыечнай сястрой паэта Ганнай Гапановіч, – расказвае загадчыца Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Марына Запартыка. – Максім прынёс ёй у падарунак свой зборнік «Вянок» – хацеў пачуць, што яна думае пра яго вершы. Але дзяўчына адказала, як адрэзала: ацаніць паэзію не зможа, бо не разумее па-беларуску. І паэт перапісаў для яе свае вершы ў асобны сшытак, пераклаўшы іх на рускую мову і даўшы зборніку рускамоўную назву «Зеленя».

Вядома таксама аб гарачых спрэчках паэта па пытаннях беларускага адраджэння са стрыечным братам Пятром. Імкнучыся разбіць скептычныя довады апошняга, Максім так распаляўся, што ў парыве эмоцый стукаў па стале і прыціскаў кулакі да грудзей, быццам імкнуўся ўзяць адтуль па-больш сілы.

А здавалася б, раслі разам, слухалі адны і тыя ж песні пра «крынічаньку», успаміны старэйшых членаў сям'і аб родным краі… І гэта яшчэ раз падкрэслівае ўнікальнасць асобы нашага нацыянальнага паэта. Ён узяў ад сваёй сям'і лепшае, што яна захавала ад спадчыны продкаў, і – пайшоў далей…

## «Быць можа, пуціна жыцця лягла пярсцёнкам, друг…»

Максіму пашчасціла знайсці аднадумцаў, якія падзялялі яго цікавасць да далёкай Беларусі, і ў сваім гімназічным асяроддзі. Вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Ірына Мышкавец ужо некалькі гадоў мэтанакіравана вывучае кола аднакласнікаў і настаўнікаў будучага паэта. Ёй удалося зрабіць на гэтай маладаследаванай дагэтуль ніве даволі цікавыя адкрыцці.

З успамінаў бацькі нам вядома, што асаблівую ролю ў станаўленні Максіма Багдановіча як беларускага паэта адыграў Андрэй Кіпрыянавіч Кабанаў – настаўнік гісторыі Ніжагародскай мужчынскай гімназіі. Адам Ягоравіч адзначаў, што «с последним Максима связывала любовь к Белоруссии и интерес к белоруссике: Кабанов – белорус по рождению и знаток белорусской истории. Впоследствии, выехав из Нижнего, Максим поддерживал с ним переписку по интересующим его вопросам». Супрацоўнікам музея ўдалося знайсці і завязаць перапіску з праўнукам гэтага настаўніка – Аляксеем Ульянавым. Як і некалі прадзед, ён жыве ў Ніжнім Ноўгарадзе. І – беларускім даследчыкам пашанцавала – валодае ўнікальнай інфармацыяй аб гісторыі сваёй сям'і.

– Высветлілася, што Адам Ягоравіч памыляўся адносна беларускага паходжання Андрэя Кіпрыянавіча Кабанава, – адзначае Ірына Мышкавец. – Яго бацька родам з Бугурусланскага павета Арэнбургскай губерні, а маці – з Уфы. Беларускай па паходжанні была жонка настаўніка – Вера Мікалаеўна Волкава. Яе бацька валодаў маёнткам у Полацкім павеце Віцебскай губерні. У 1903 годзе Андрэй Кіпрыянавіч і Вера Мікалаеўна абвянчаліся ў Сіроцінскай царкве, што знаходзілася непадалёк ад маёнтка, пазней неаднойчы прыязджалі да бацькоў у Беларусь. А вось наконт «знатока белорусской истории» ў дачыненні да маладога настаўніка Адам Багдановіч меў рацыю. Андрэй Кіпрыянавіч займаўся сур'ёзнымі навуковымі даследаваннямі гісторыі і геаграфіі Беларусі. Ён з'яўляўся адным са складальнікаў кнігі «Верхнее Поднепровье и Белоруссия», якая ўваходзіла ў шматтомнае навуковае выданне «Россия. Полное географическое описание нашего Отечества: настольная и дорожная книга для русских людей» і была выдадзена ў Санкт-Пецярбургу ў 1905 годзе. Што і казаць, Багдановічу пашанцавала з такім настаўнікам.

Вядома: менавіта да Кабанава юны гімназіст звярнуўся з просьбай парэкамендаваць спіс літаратуры пра Беларусь. І настаўнік гэта зрабіў, чым вельмі дапамог яму ў справе вывучэння роднага краю. Ёсць падстава меркаваць, што Кабанаў прапанаваў якраз спіс літаратуры, выкарыстанай ім і суаўтарамі з кнігі «Верхнее Поднепровье и Белоруссия».

Дарэчы, як высветлілася, лёс Андрэя Кіпрыянавіча склаўся трагічна, ён ненадоўга перажыў свайго вучня. Настаўнік не знайшоў агульнай мовы з новай савецкай уладай і ў 1922 годзе памёр у лагеры.

Што датычыцца сяброў будучага класіка беларускай літаратуры, то найбольш блізкі яму па духу быў Дзіядор Дзябольскі, з якім

ён разам вучыўся ў яраслаўскай гімназіі і якому прысвяціў верш «Быць можа, пуціна жыцця…». Дзябольскі пакінуў успаміны, у якіх узгадваў: Максім прыносіў яму беларускія кнігі і газеты, чытаў свае вершы, дзяліўся думкамі аб паэзіі. «Когда Максим принес мне в подарок свой первый сборник «Вянок», многое из него он читал мне вслух и рассказал, что он хотел им показать, что в белорусскую поэзию могут быть введены все размеры, какие только существуют и применяются в любой другой, скажем, в русской поэзии, и что белорусский язык настолько богат, что на нем может быть дана, и в любом размере, любая поэтическая тема».

Трэба адзначыць, што апошнім часам мэтанакіраваная праца супрацоўнікаў музея дала магчымасць высветліць кола аднакласнікаў будучага паэта, якія раней заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў, і пачаць пошук іх нашчадкаў. Такім чынам, на гэтым шляху нас могуць чакаць новыя цікавыя адкрыцці.

Пакуль атрымалася ўсталяваць кантакт з нашчадкамі яшчэ аднаго аднакласніка і сябра Максіма Багдановіча па яраслаўскай гімназіі – Сяргея Арлеанскага. Яго ўнучаты пляменнік Аляксей Арлеанскі цяпер жыве ў г. Рыбінску Яраслаўскай вобласці. Ён таксама шмат гадоў вывучае свой радавод, збірае сямейныя фотаздымкі, дакументы. І змог даслаць у Мінск не толькі цікавыя матэрыялы, але і лічбавую копію фотаздымка Сяргея Арлеанскага якраз у гімназічным узросце. Такі ж адкрыты і адухоўлены, як у юнага Багдановіча, твар… Няцяжка ўявіць сабе гэтых прыгожых гімназістаў за шчырай размовай аб тым, што сапраўды турбавала сэрца, магчыма, і аб любай для паэта Беларусі…

## «Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца…»

Мы справядліва наракаем: наша сённяшняя моладзь у асноўнай сваёй масе даволі дрэнна ведае беларускую мову, хоць і гадамі вывучае яе ў школе. І асаблівую павагу выклікае той факт, што Максім Багдановіч здолеў засвоіць яе абсалютна самастойна, упарта займаючыся ў вольны ад асноўных заняткаў у гімназіі і дамашніх заданняў час. Прытым што пасля пераезду ў Яраслаўль у яго пачаліся праблемы са здароўем – спасціг «праклён сям'і» Багдановічаў, туберкулёз, ад якога ўслед за маці ўсяго ў 18 гадоў пайшоў з жыцця старэйшы брат Вадзім.

– Ніякіх цяплічных умоў для вывучэння беларускай мовы ў Багдановіча не было, – адзначае вядомы багдановічазнавец кандыдат філалагічных навук Мікола Трус. – Калі звернемся нават да беларускага перыяду яго дзяцінства, то Адам Ягоравіч і Марыя Апанасаўна размаўлялі па-руску. Захаваўся ліст, напісаны маці да бацькі падчас адпачынку ў вёсцы Вяззе. Яна скардзіцца, што дзеці навучыліся гаварыць па-беларуску, як вернуцца ў Гродна, трэба будзе перавучваць. І тут нельга наракаць на бацькоў. Для канца XIX стагоддзя такая моўная палітыка была нормай, бо адпавядала тагачасным рэаліям. Тым больш, ніякіх умоў для вывучэння беларускай мовы не было пасля ні ў Ніжнім Ноўгарадзе, ні ў Яраслаўлі. Дарэчы, бацька, як былы выкладчык, меў «пункцік» на правільным рускім вымаўленні – адсочваў, каб у дзяцей не праскоквалі кантрольныя беларускія гукі. Такім чынам, вывучэнне беларускай мовы было цалкам уласным выбарам Максіма Багдановіча.

Падручнікаў па беларускай мове ў гімназіста Багдановіча, зразумела, не было. Выкарыстоўваў для заняткаў «Словарь белорусского наречия» Івана Насовіча, кнігу «Беларусы» Яўхіма Карскага і іншыя акадэмічныя выданні з бібліятэкі бацькі. Адам Ягоравіч успамінаў: «Какие трудности он преодолел на этом пути, свидетель-

▼ **Паштоўка Максіма Багдановіча ў рэдакцыю «Нашай нівы» аб падпісцы на газету. 1909 год** (з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва)


330 325/12

Подписываюсь на „Н. Н." на 2 экз. русским шрифтом

Адрес мой: Ялта, Аутка, дача „Шалаш", М. А. Богдановичу.

М. Богданович

ствуют его рукописи и тетради: сколько там выписок из словарей, сборников и старопечатных книг! Какой из поэтов, всосавших белорусскую речь с молоком матери, поднимал этот тяжелый, кропотливый, крохоборческий труд? А он, слабогрудый, хилый, поднял. И нес его терпеливо, упорно, и для меня и для всех окружающих незаметно. Он редко обращался ко мне за советом и разъяснением. А больше не к кому было обратиться и, правду говоря, ни к кому он и не обращался. Он да книга».

Максім Багдановіч імкнуўся адсочваць усю літаратуру, якая з'яўлялася па-беларуску і пра Беларусь, карыстаўся папулярнай у той час практыкай замовы кніг па пошце. І, зразумела, вельмі шмат важнага для яго самаадукацыі, творчасці і ўвогуле жыцця дало супрацоўніцтва з «Нашай нівай». Як вядома, упершыню газету выпісала яму хросная маці Вольга Епіфанаўна Сёмава, якая жыла ў Пінску і працавала ў жаночым вучылішчы. Яна падтрымлівала з хрэснікам перапіску, ведала аб яго цікавасці да беларускага слова і вырашыла зрабіць такі падарунак. Пазней Максім Багдановіч выпісваў выданне ўжо самастойна. У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваецца ўнікальны дакумент – напісаная ўласнай рукой паэта паштоўка ў рэдакцыю «Нашай нівы» аб падпісцы на газету за 1909 год.

Можна сабе ўявіць, якім шчасцем стала для паэта ўбачыць на старонках выдання ўласныя беларускамоўныя творы, пачынаючы ад першых надрукаваных – апавядання «Музыка» (1907) і верша «Над магілай» (1909). Дастойная ўзнагарода за ўпартую і цяжкую працу. Адам Багдановіч успамінаў: «Ясно помню его радость в лице и сверкавшие живым огоньком глаза, когда он, вбежав в мою комнату, показывал мне напечатанными свои стихи. Это было в Нижнем, на Канатной улице, в доме Павловой. Понятна эта радость. Тут не только говорило самолюбие, столь свойственное молодости, видеть свое имя в печати, но и нечто большее: сознание, что подготовительные труды были не бесцельны, что он, оторванный от родины, заговорил о своих чувствах ее языком, хотя бы и не совсем чистым, пусть даже картавым, но это дело все исправляющего времени, а пока есть куда притулиться и дать исход накопившимся чувствам и смутным мечтам о далекой таинственной родине: гукнуть издалека – и услышать созвучный отклик»…

Прыемна адзначыць: і ў наш час ёсць моладзь, што, як некалі Максім Багдановіч, самастойна вывучае беларускую мову ўдалечыні ад Беларусі. На Міжнародным навуковым кангрэсе беларускай культуры, які адбыўся ў маі 2016 года ў Мінску, мне давялося пазнаёміцца з намеснікам старшыні беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Урала» Аляксандрам Блешчыкам. Цяжка было паверыць, але гэты малады хлопец, які так выдатна размаўляе па-беларуску, усё жыццё пражыў у Екацярынбургу – гэта за 2 тысячы кіламетраў ад Беларусі!

– Мой дзед родам з Радашковічаў, у Екацярынбург пераехаў жыць пасля вайны, – распавёў Аляксандр. – Ён памёр раней, чым я нарадзіўся, але пасля яго засталося шмат нататнікаў, вершаў, замалёвак на беларускай мове. Калі я прачытаў іх, то вельмі здзівіўся: нягледзячы на тое, што дзед апынуўся так далёка ад радзімы, яна жыла ў яго сэрцы да апошняга дня. І неяк само сабой прыйшло жаданне больш даведацца пра Беларусь і вывучыць беларускую мову.

Як і Максім Багдановіч, Аляксандр Блешчык вучыў мову продкаў самастойна, у вольны час. Лягчэй было толькі таму, што ў яго былі і падручнікі, і дапамога інтэрнэтрэсурсаў. А не так даўно Аляксандр Блешчык разам з аднадумцамі адкрыў на базе адной з екацярынбургскіх бібліятэк шко-

▼ Музей Максіма Багдановіча «Беларуская хатка» ў Мінску (на стадыі рамонту)



лу беларускай мовы і культуры. Па слядах Багдановіча крочыць новая моладзь…

## «Цвяток радзімы васілька…»

Часам можна пачуць, маўляў, Багдановіч таму так захапляўся Беларуссю, што жыў далёка ад яе, вось і стварыў нейкі ідэалізаваны вобраз… Аднак шматлікія факты сведчаць: новыя, ужо дарослыя сустрэчы паэта з радзімай былі самымі шчаслівымі момантамі ў яго жыцці.

– Калі я ўпершыню апынуўся ў Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, быў у захапленні, – дзеліцца думкамі Мікола Трус. – Найбагацейшая архітэктура, унікальныя помнікі, старажытныя абразы… Трэба сказаць, яраслаўская школа іканаграфіі вельмі ўражвае. Чаму паэт з такой чулай да сапраўднай прыгажосці душой не натхніўся імі?! Відаць таму, што ён быў рамантыкам. Яго вабіла далеч – геаграфічная, гістарычная. Але калі Максім Багдановіч пабываў у Беларусі, ніхто не сведчыць пра нейкія расчараванні. Наадварот, сустрэча з радзімай, аднадумцамі з «Нашай нівы» стала вялікім стымулам для творчасці, абагаціла яго вершы шэрагам новых сюжэтаў і вобразаў.

Менавіта паездцы ў Вільню, якая адбылася ў 1911 годзе, мы абавязаны з'яўленнем такіх шэдэўраў беларускай літаратуры, як «Слуцкія ткачыхі», «Пагоня», а таксама шэрага вершаў з цыкла «Места» – «У Вільні», «Ад спёкі пышуць дахі і асфальт», «На гулкіх вулках – ноч глухая» і інш. Дарэчы, дзякуючы гэтаму цыклу Максім Багдановіч лічыцца першым у гісторыі нацыянальнай літаратуры паэтам-урбаністам. У адрозненне ад іншых беларускіх паэтаў таго часу, якія чэрпалі натхненне выключна ў вёсцы, ён змог адчуць яго і на віленскіх «паясах тратуараў».

На верш «Пагоня» паэта натхніў герб, які ён пабачыў у Вільні на Вострай браме. А верш «Слуцкія ткачыхі» нарадзіўся пад ўражаннем ад наведвання прыватнага беларускага музея братоў Луцкевічаў, заснавальнікаў «Нашай нівы», па запрашэнні якіх ён і прыехаў у Вільню. У музеі захоўваліся калекцыі старажытных рарытэтаў, у тым ліку славутых слуцкіх паясоў. Вацлаў Ластоўскі, які шмат часу правёў тады з Багдановічам, успамінаў: Максім у захапленні аглядаў слуцкія паясы некалькі разоў.

Глытком свежага паветра сталі для паэта і месяцы ў фальварку Ракуцёўшчына




▲ Дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Ганна Запартыка на выставе «Хай згадка згадку кліча…» да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча

каля Маладзечна – у дзядзькі братоў Луцкевічаў. Красамоўны факт – у гэты час Максім адпусціў бараду. Трэба разумець, змог цалкам расслабіцца і адчуць асалоду ад вясковага жыцця. Натхнёны сустрэчай з родным краем, паэт перажывае творчы ўздым і плённа працуе. З'яўляецца шэраг вершаў, якія потым увайшлі ў «Вянок» – адзіны прыжыццёвы зборнік Багдановіча. Дарэчы, у аснову паэмы «У вёсцы» з «вянковага» цыкла «Мадонны» быў пакладзены рэальны выпадак, які здарыўся з ім падчас прагулкі. Яго «мадоннай» стала простая ракуцёўская вясковая дзяўчына. Вядома, што другая паэма з гэтага цыкла – знакамітая «Вераніка» – таксама была напісана паэтам у Ракуцёўшчыне.

Апошняй сустрэчай Багдановіча з радзімай стаў яго прыезд у Мінск у кастрычніку 1916 года. Ішла Першая сусветная вайна, паэт імкнуўся дапамагчы сваёй краіне не толькі словам, але і справай. Нават нягледзячы на тое, што туберкулёз прагрэсіраваў і стан яго здароўя значна пагоршыўся. Уладкаваўся сакратаром харчовага камітэта мінскай губернскай управы, пачаў працаваць у Беларускім таварыстве дапамогі пацярпелым ад вайны. Жыў у хаце, дзе здымаў некалькі пакояў Змітрок Бядуля (цяпер у ёй размешчаны музей «Беларуская хатка»).

Сяброўка і калега Багдановіча па таварыстве Зоська Верас у сваіх успамінах распавяла пра выпадак, які вельмі добра раскрывае выдатныя чалавечыя якасці нашага класіка. С першага ж дня ў Мінску ён адмаўляўся

класці ў сваю гарбату цукар, а калі нехта перамяніў шклянку, па дабрыні сардэчнай падсунуўшы хвораму паэту салодкую гарбату, вельмі разззлаваўся. Як высветлілася пазней, ён мэтанакіравана збіраў цукар са свайго пайка, што атрымліваў у харчовым камітэце, для дзяцей бежанцаў. У выніку назбіраў і перадаў у прытулак паўпуда цукру! Між іншым, салодкую гарбату Максім Багдановіч любіў.

...Ён шчаслівы ад сустрэчы з родным Мінскам. Зоська Верас з вялікімі цяжкасцямі адрывае яго па дарозе на працу ад Чырвонага касцёла, выглядам якога ён не мог нацешыцца – доўга стаяць на холадзе і вільгаці для хворага маладога чалавека было смяротнай небяспекай. Яго стан увесь час пагаршаўся. Сваю знакамітую «Пагоню» паэт ствараў пры тэмпературы 38–39 градусаў, якая ўжо цяжка збівалася. «У гарачцы пішацца лёгка», – сказаў ён сябру Аркадзю Смолічу. Аб сваім здароўі Багдановіч клапаціўся мала, увесь час забываўся прымаць патрэбныя лекі, прыходзілася яго кантраляваць. Затое ахвотна працаваў над чытанкай (хрэстаматыяй) для беларускай школы – падбіраў вершы з беларускай літаратуры, рабіў пераклады, пісаў сам...

У лютым 1917 года Максіма Багдановіча выправілі з Мінска на лячэнне ў Ялту. Ён спадзяваўся, што, падлячыўшыся, яшчэ вернецца на радзіму. Верыў у містыку лічбаў: яго маці Марыя Апанасаўна нарадзілася ў 1869 годзе, а памерла ў 1896, і паэт з яго 1891 годам нараджэння да 1919-га планаваў дацягнуць. Але вельмі засмуціўся, калі перад самым ад'ездам адна з сясцёр Змітрака Бядулі выпадкова разбіла яго любімае маленькае люстэрка ў жалезнай апраўе. Дрэнны знак, дрэнны...

Ён памёр у Ялце 25 мая (па новым стылі) 1917 года ў поўнай адзіноце. Там і пахаваны на гарадскіх могілках. Да гэтага часу дыскутуецца пытанне аб перапахаванні паэта на роднай беларускай зямлі. Душой ён, вядома ж, тут заўсёды быў і застаецца...

## «Тым імя мілае вышэй...»

За сваё кароткае жыццё Максім Багдановіч здолеў зрабіць для Беларусі вельмі шмат. Ён падараваў нам выдатныя ўзоры грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай і, вядома ж, любоўнай лірыкі. На яго вершы напісаны цудоўныя песні. Трапяткую і светлую «Вераніку» з музыкай Ігара Лучанка ў выкананні вядомага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры» ведаюць і любяць у самых розных краінах свету.

«Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны для гэтай душы. Ёсць ён і ў нас, беларусаў, і мы мусіма звярнуцца да яго, каб улажыць штонебудзь сваё ў скарбніцу светавай культуры, каб уліць у нашу паэзію свежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народу, лепі паталіць яе духоўную смагу і запраўды ўзяцца за вялікую працу: развіццё беларускай народнай культуры», – разважаў Багдановіч у артыкуле «Забыты шлях». І ён стварыў яго, той самы кранаючы беларускую душу верш. Таму і застаецца ўжо больш за стагоддзе адным з нашых самых любімых і цытуемых нацыянальных паэтаў.

Багдановіч узбагаціў беларускую літаратуру новымі для яе вершаванымі формамі – трыялетам, санетам, рондо, актавай («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі», «Калісь глядзеў на сонца я» і іншыя). Перакладаючы на беларускую мову лепшыя творы рускіх, украінскіх, нямецкіх, французскіх і іншых аўтараў, паэт набліжаў нашу маладую літаратуру да сусветнай класікі, пашыраў літаратурны далягляд сваіх суайчыннікаў. Дзякуючы яго выдатнаму таленту па-беларуску загучалі такія прызнаныя геніі слова, як Пушкін, Гейнэ, Шылер, Верлен, Гарацый, Авідзій. Разам з тым Максім Багдановіч перакладаў на рускую мову творы выдатных беларускіх і ўкраінскіх майстроў слова, у тым ліку Я. Купалы, Т. Шаўчэнкі, І. Франко, папулярызуючы іх творчасць сярод рускамоўнага чытача.

Адметны след пясняр Беларусі пакінуў не толькі ў паэзіі. Яго спадчына – гэта таксама яркія ўзоры мастацкай прозы, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі. Шкада, што яны малавядомыя шырокаму чытачу, застаючыся як бы ў цені яго паэзіі.

Трэба сказаць, нават першае надрукаванае ў «Нашай ніве» апавяданне – «Музыка» – было заўважана і станоўча ацэнена крытыкамі. Так, украінскі даследчык Іван Свянціцкі ў сваёй працы «Адраджэнне беларускага пісьменства» напісаў, што «Музыка» можа прэтэндаваць на тое, каб стаць маніфестам новай беларускай літаратуры. Варта адзначыць і шэраг паз-

нейшых апавяданняў і нарысаў Багдановіча, напісаных ім на беларускай і рускай мовах, – «Апокрыф», «Колька», «Несчастный случай», «Преступление» і інш.

Артыкулы Максіма Багдановіча, у якіх ён аналізуе гісторыю і сучасны стан беларускай літаратуры, фактычна паклалі пачатак айчыннай прафесійнай літаратурнай крытыцы. Тое, што Багдановіч жыў далёка ад Беларусі, у дадзеным выпадку было толькі на карысць – ён не быў звязаны нейкімі кулуарнымі адносінамі і мог дазволіць сабе максімальную аб'ектыўнасць. Дарэчы, у цэнтры ўвагі Багдановіча-крытыка былі не толькі беларускія, але таксама рускія і ўкраінскія паэты і пісьменнікі.

Паспеў праявіць сябе Максім Багдановіч і як таленавіты публіцыст, якога цікавіла шырокае кола тэм. Актыўна друкуючыся ў расійскіх і ўкраінскіх выданнях, ён дапамагаў іх чытачам больш даведацца пра Беларусь, надаваў шмат увагі агульнаславянскай праблематыцы, гісторыі нашых народаў. Вельмі паказальны той факт, што творчасць Багдановіча яшчэ пры жыцці была запатрабавана ў тым ліку і за межамі Расійскай імперыі. Да гэтага часу знаходзяцца раней невядомыя публікацыі яго артыкулаў і літаратурных твораў, якія пабачылі свет у розных краінах свету.

Не так даўно багдановічазнавец Мікола Трус выявіў у архіве адной з кіеўскіх бібліятэк брашуру «Угорская Русь», якая была выдадзена ў г. Скрэнтан (ЗША, штат Пенсільванія) у 1916 годзе. Яна ўяўляе сабой пераклад на ўкраінскую мову аднайменнага рускамоўнага гісторыка-этнаграфічнага нарыса Максіма Багдановіча. Трэба адзначыць, што ў тыя часы выходзіла шмат артыкулаў аб Угорскай Русі – гэта тэма цікавіла аўтарытэтных даследчыкаў. І тое, што ўкраінскай дыяспарай у ЗША для асобнага выдання быў выбраны менавіта артыкул Максіма Багдановіча, пра многае сведчыць.

Акрамя таго, у бібліятэцы ўніверсітэта г. Браціслава (Славакія) Мікола Валянцінавіч знайшоў брашуру «Беларускае адраджэнне» на ўкраінскай мове, выдадзеную ў 1916 годзе ў Вене. Гэты артыкул Максіма Багдановіча быў цалкам прысвечаны беларускай літаратуры. Прыемна, што ён аказаўся цікавым не толькі беларусам і паслужыў папулярызацыі нашай нацыянальнай культуры.



Выданні твораў Максіма Багдановіча розных гадоў

Яшчэ адно адкрыццё было зроблена Міколам Трусам у дачыненні да знакамітага «Апокрыфа» Максіма Багдановіча. Выяўлены яго пераклад на ўкраінскую мову, надрукаваны ў Берліне ва ўкраінскім часопісе «Летапіс» (1924). Трэба сказаць, што «Летапіс» быў сур'ёзным выданнем, дзе друкавалі толькі знакавых аўтараў. Так, побач з «Апокрыфам» Максіма Багдановіча змешчаны твор вядомага амерыканскага пісьменніка Эдгара По. Зразумела, гэта працавала на імідж маладой беларускай літаратуры – разам з апавяданнем была надрукавана біяграфічная даведка, у якой Багдановіч быў прадстаўлены як адзін з самых яркіх беларускіх паэтаў.

***

…Ён мог бы зрабіць яшчэ так многа… І ўсё ж галоўнае паспеў – паказаць свету ўнікальны прыклад вялікай, сапраўднай, бескарыслівай любові да Радзімы. Выдатнаму майстру паэтычнага слова пашчасціла мець побач людзей, якія падтрымалі яго на нялёгкім шляху вяртання да каранёў, – членаў сям'і, настаўнікаў, сяброў, калег па творчым цэху. Аднак толькі неверагодныя ўласная вера Максіма Багдановіча ў Беларусь, сіла духу і ўпартасць у дасягненні пастаўленай мэты дапамаглі яму, народжанаму беларусам, стаць беларусам сапраўдным.

**Аксана МЫЦЬКО**
**Фота аўтара**